гаў-сучаснікаў. Таму менавіта верш “Храм навукі” абраны гімнам нашага каледжа. Музыку да яго стварыў таксама выдатны выкладчык каледжа Уладзімір Аляксеевіч Масленікаў.

**Заключэнне.** Вобраз каледжа як “храма навукі” выразна выяўлены ў творчасці Надзеі Ярмак не толькі ў якасці элемента апісання гарадскога жыцця ў апавяданнях-мініяцюрах, але і як канкрэтны адрасат прысвячэнняў у вершах, насычаных пяшчотнымі пачуццямі, шчырай адданасцю роднай навучальнай установе.


1. Ярмак Надзея. Всего понемногу – Літаратурна-мастацкае выданне. На правах рукапісу. – Полацк, 2006. – 30 с.
2. Ярмак Надзея. Дастаць зорачку : вершы і песні – Літаратурна-мастацкае выданне. На правах рукапісу. – Полацк, 2001. – 87 с.
3. Ярмак Надзея. Рэха дабрыні: выбранае– Літаратурна-мастацкае выданне. На правах рукапісу. – Полацк, 2002. – 352 с.


## СПЕЦЫФІКА ДЫЗАЙНЕРСКАГА АФАРМЛЕННЯ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ВЫДАННЯ НА ПРЫКЛАДЗЕ ЧАСОПІСА “МАЛАДОСЦЬ”


***Селязень К.Я.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Навасельцава Г.В.,*** *канд. філал. навук, дацэнт*



Ключавыя словы. Часопіс, дызайн, вокладка, колер, змест, фотаздымак.
Keywords. Magazine, design, cover, color, content, photo.


Для друкаваных сродкаў масавай інфармацыі важна захоўваць сваё праблемнае поле, утрымліваць чытацкую аўдыторыю. У сучасным медыйным асяроддзі традыцыйны літаратурны часопіс не губляе сваёй актуальнасці, паколькі назапасіў значны творчы вопыт і застаецца цікавым для сваіх чытачоў, увагу якіх прыцягвае ў тым ліку дзякуючы арыгінальнаму дызайнерскаму афармленню. У сувязі з вышэй сказаным мэтай даследавання выступае вывучэнне вопыту дызайнерскага афармлення сучаснага літаратурнага выдання на прыкладзе часопіса “Маладосць”.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам абраны штомесячны літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны ілюстраваны часопіс “Маладосць”, які выдаецца з красавіка 1953 года. Прааналізаваны выбраныя нумары выдання за розныя гады. Выкарыстаныя метад агляду СМІ, параўнальна-супастаўляльны метад.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Шматгадовая выдавецкая праца паспрыяла выпрацоўцы шэрагу правілаў, якія не страцілі сваёй значнасці і сёння. У прыватнасці, часопіс вылучаецца “цвёрдым” макетам, што азначае наяўнасць пастаянных рубрык і тэматычных палос, а таксама адносна ўстойлівага дызайнерскага афармлення, у выніку чаго ў чытацкім успрыманні фарміруецца пазнавальны вобраз. Рэдакцыя паслядоўна змяшчае празаічныя і паэтычныя творы аўтараў розных узростаў, чым рэалізуе прынцып творчай пераемнасці, менш паслядоўна гэтае правіла вытрымліваецца для калумністыкі, перакладаў, публіцыстычных матэрыялаў. Варта адзначыць, што цікавасць аўдыторыі ў значнай меры падтрымліваюць спецнумары і спецпраекты.

У афармленні часопіс мае шэраг пераваг над газетай. Дзякуючы высокай якасці паліграфіі ў дызайнера з’яўляецца магчымасць выкарыстоўваць значную колькасць сродкаў, якія дапамогуць прыцягнуць увагу чытачоў. Гэта могуць быць шрыфты, якасныя фотаздымкі, колеравая палітра і іншае. Разгледзім элементы дызайну на прыкладзе штомесячнага літаратурна-мастацкага часопіса “Маладосць”. Схема кожнага часопіса можа значна адрозніваецца і быць даволі скаданай, калі браць пад увагу раздзелы і іх размяшчэнне ў часопісе.

На вокладцы часопіса не размяшчаюцца ніякія матэрыялы, як гэта можна пабачыць на першай паласе газет. Гэта дазваляе выкарыстоўваць шрыфты вялікіх памераў і размяшчаць надпісы больш свабодна, што дапаможа чытачу лёгка знайсці патрэбную інфармацыю пра дадзены нумар. Так, на вокладцы можна пабачыць саму назву часопіса, дату з нумарам выпуску і анонсы [1].

Дызайнеры могуць змяшчаюць на вокладцы вялікі фотаздымак, што адлюстроўвае змест галоўнага матэрыяла або тэматыку дадзенага выпуску. Так, часопіс "Маладосць" у 2014 годзе змяшчаў на вокладках фотаздымкі, якія займалі асноўную частку старонкі. З-за гэтага надпісы накладваліся на фотаздымак і часам зліваліся з ім. З 2015 па 2017 год выданне выпускалася з рознакаляровымі вокладкамі, фотаздымкаў і малюнкаў на якіх не было.

Ужо вялікія фотаздымкі не маглі перашкодзіць чытанню інфармацыі, але ўзнікала новая праблема. З-за таго, што нумары не былі ў адной коллеравай гамме, чытачам цяжка было знайсці дадзенае выданне сярод усіх астатніх. З 2018 па 2020 год можна назіраць вокладкі шэрага колеру. Аднак ад каляровага элемента дызайнеры не адмовіліся. Злева з'явілася вертыкальная паласа, колер якой змяняўся кожны нумар. Пасля у межах гэтай паласы з'явіліся фотаздымкі, якія адлюстроўвалі змест ці тэматыку прадстаўленых у часопісе матэыялаў. У нумарах 2021 года і да нашага часу вертыкальная паласа была заменена на гарызантальную, якая займала значна менш месца. І колер вокладкі быў зменены з шэрага на аранжавы. Гэта таксама паспрыяла прыцягненню ўвагі новых чытачоў, таму што аранжавы больш кідаецца ў вочы, чым шэры.

Заўважым, што з 2021 года часопіс "Маладосць" поўнасцю стаў каляровым. Да гэтага часу унутраны змест быў чорна-белым. У дызайнераў з'явілася магчымасць больш шырока выкарыстоўваць уплыў колеравай палітры на чытачоў. Так, у апошніх нумарах мы бачым спалучэнне аранжавага, блакітнага і чорнага. Улічваючы, што яркія колеры падабаюцца маладому пакаленню, то аранжавы ўдала падабраны для таго, каб прыцягнуць увагу новых чытачоў. Блакітны выдзяляе асноўныя элементы на старонцы: назву рубрыкі, імя аўтара і загаловак тэкстаў. Ён не кантрастуе з аранжавым, а ідэальна дапаўняе яго. Чорны ж з'яўляецца класічным. Таксама фонавы колер старонак быў зменены з белага на светла-бэжавы. Гэта значна спрашчае чытанне і зніжае напружанне вачэй [2].

Яшчэ адным асноўным элементам з'яўляецца змест. Памер часопісаў можа складаць больш за сто старонак, таму змест проста неабходны для таго, каб чытач змог лёгка арыентавацца. Улічваючы тое, што часопіс вельмі часта не чытаюць поўнасцю, а толькі той матэрыял, які на дадзены момант цікавіць, то мэтазгодна змяшчаць змест на першых старонках, як гэта і зроблена ў "Маладосці".

Важным з'яўляецца і правільнае размяшчэнне тэкстаў. У адрозненні ад газеты, часопіс не мае строгай патрэбы ў размяшчэнні на адной старонцы як мага большай колькасці матэрыялаў, асабліва калі гэта выключна электроннае выданне. Часопіс "Маладосць" не мае патрэбы ў вялікай колькасці тэкставых калонак. Матэрыял размяшчаецца з якаснымі ілюстрацыямі і друкуецца вялікім шрыфтам, які лёгка прачытаць.

Дзякуючы свабоднай прасторы, дызайнер можа творча падыходзіць да афармлення рубрык. Так, у 2017 годзе ў "Маладосці" змяшчалася рубрыка пад назвай "Лакацыя рэха". Абавязковым элементам у ёй быў фотаздымак кажана, а галоўнай асаблівасцю – перавернуты тэкст. Такі незвычайны падыход да афармлення адразу прыцягне ўвагу чытача да матэрыялаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, літаратурны часопіс "Маладосць" выступае цэласнай сістэмай з дынамічнымі кампанентамі, якія ілюструюць цікавыя прыклады творчага вопыту, актуальнага для іншых мастацкіх выданняў. Сучасныя медыйныя праекты творча адаптуюць практыку традыцыйных СМІ, шукаюць новых падыходаў для падтрымання ўстойлівай сувязі з аўдыторыяй. Сучасны літаратурны часопіс працуе з невялікім колам чытачоў у адметным фармаце. Дызайн часопіса з'яўляецца адным з важнейшых сродкаў прыцягнення ўвагі чытачоў. Колеры, шрыфты, правільнае размяшчэнне ілюстрацый і тэкстаў уплываюць на ўспрыманне матэрыялаў. Без якаснага дызайна выданню цяжка будзе дасягнуць поспехаў і прыцягнуць мэтавую аўдыторыю.

1. Исаков, Г.П. Цветоведение: методические рекомендации / Г.П. Исаков ; М-во образования РБ, УО "Витебский гос. ун-т им. П. М. Машерова". – Витебск : Изд-во УО "ВГУ им. П.М. Машерова", 2008. – 51 с. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/2664 (дата звароту 10.09.2022) (дата звароту: 09.09.2022)

2. Яцюк, О. Основы графического дизайна на базе компьютерных технологий / О. Яцюк. – СПб.: БХВ-Петербург, 2004. – 240 с.